Разам з тым поўнага перарывання гэтых сувязаў не адбылося.

У беларуска-нямецкіх культурных сувязах ХУШ стагоддзя важнае месца належыць дырыжору і кампазітару У.Д.Галянду, які меў сталую службу у Нясвіжскім оперна-балетным тэатры. Высокую адзнаку сучаснікаў атрымала яго опера «Агатка, або Прыезд пана», лібрэта да якой напісаў віленскі кашталян Мацей Радзівіл.

У нямецкіх дзяржавах неаднойчы звярталі увагу на рэлігійную сітуацыю у ВКЛ. Вядома, што у час рэлігійных ганенняў у ХУП-ХУШ стагоддзях лютэране карысталіся падтрымкай Прусіі.

У ХУШ ст. Рэч Паспалітая становіцца не столькі суб'ектам геапалітычных дачыненняў у Еўропе, колькі аб'ектам. На яе знешнепалітычнае становішча усе больш уплываюць суседнія моцныя манархіі з абсалютысцкімі рэжымамі – Расія, Прусія і Аўстрыя.

У гэтых умовах ей як ніколі патрабавалася выдатная постаць на каралеўскім троне. Аднак падзеі развіваліся насуперак дадзенаму патрабаванню. З 1697 па 1763 гг. каралямі польскімі і вялікімі князямі літоўскімі былі немцы, якія не разумелі сапраўдных інтарэсаў і Кароны польскай, і Вялікага княства Літоўскага. Размова ідзе пра Аўгуста Моцнага (1670-1733) і яго сына Аўгуста III (1696-1763). Яны адначасова былі саксонскімі курфюрстамі, часта прымалі памылковыя рашэнні, якія мелі вельмі сур'езныя наступствы і былі на руку ворагам нашых суайчыннікаў.

Прусія мела непасрэднае дачыненне да таго, што у 1795 годдзе Рэч Паспалітая знікла з палітычнай мапы свету і, натуральна, перастала існаваць Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае.

Васемнаццатае стагоддзе азнаменавала новы этап у беларуска-нямецкіх адносінах, калі у Брэст-Літоўскім уездзе Гародзенскай губерніі у 1790 г. выхадцамі з Вюртэнберга былі заснаваны калоніі Нейброў і Нейдорф. З іх дзейнасцю пачыналася новая старонка у тагачасных беларуска-нямецкіх сувязях.

## ИСТОРИЯ РЕШЕНИЯ ПРОБЛЕМЫ ВОССОЕДИНЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА

Кудрицкая Е.Г.

*Брестский политехнический институт*

События 1939 года все дальше и дальше отходят в историю. На протяжении вот уже 60 лет эта тема волнует многих историографов. С позиции сегодняшнего дня мы пытается дать объективную оценку сталинско-молотовской дипломатии. Мы критикуем ее за негибкость, безнравственность. Однако не стоит концентрировать внимание только на вопросах морали и нравственности. Следует учитывать и такой важный фактор международных отношений и внешней политики, как переплетение различных государственных интересов, пусть даже понимаемых с точки зрения сегодняшнего дня, как

неверные или фальшивые, но без которых просто немыслимо понять развитие событий в те драматические годы.

Итак, в конце 30-х годов над Европой нависла угроза возникновения второй мировой войны. Она исходила от гитлеровской Германии. Запад прекрасно отдавал себе отчет, какую опасность миру несет фашистская экспансия, но продолжал вести политику «умиротворения», заботясь в первую очередь о безопасности своей страны, своего народа. Летом 1939 года начались переговоры СССР с Англией и Францией. Бесспорно, жесткая линия советской делегации не содействовала плодотворному завершению переговоров, но если бы было обнародовано хотя бы заявление о готовности трех стран совместно противостоять агрессии, это имело бы большое значение на пути создания антигитлеровской коалиции. Если анализировать советско-польские отношения, то их трудно просто понять. Правительство Рыдз-Смиглы до 23 августа 1939 года сделало максимум отрицательного и непродуманного. Советское руководство отчетливо представляло, какую опасность представляет для СССР польско-германский альянс. Оно неоднократно обращалось к польскому правительству с предложением заключить договор о взаимопонимании на случай нападения Германии на Польшу. Однако предложения советской стороны недальновидными польскими политиками отвергались. Судьба Польши уже была предрешена.

Что же оставалось делать СССР, который быстро раскусил двурушничество западных держав. Надо было готовиться к отражению агрессии с двух сторон – со стороны Германии и со стороны Японии. Надо было крепить оборону, поднимать экономику. И пакт о ненападении, заключенный 23 августа 1939 года, был единственно возможным и верным шагом в тех условиях. Кроме договора был подписан секретный дополнительный протокол о разделении сфер влияния и интересов. Кульминацией этого процесса стал «Договор о дружбе и границе между СССР и Германией» от 28 сентября 1939 года. Можно подвергать критике пункты этих договоров, но эти события уже в прошлом, поэтому нам проще оценивать ранее свершившееся.

1 сентября 1939 года Германии напала на Польшу. Москва, несмотря на требования Берлина выступить против польской армии, не предпринимает военных действий. И только после подписания 15 сентября 1939 года советско-японского соглашения, в частях Красной Армии зачитывается приказ о начале освободительного похода на запад. В приказе подчеркивается освободительная миссия советских войск. 17 сентября 1939 года Красная Армия перешла польскую границу, вступив на территорию Западной Белоруссии и Западной Украины. Произошло исторически оправданное воссоединение белорусских земель. Фактически между польскими и советскими солдатами военных действий не было. СССР не объявлял войны ни Польше, ни польскому народу. Поэтому утверждения о том, что Красная Армия, освобождая западных белорусов и украинцев, помогла стереть с карты мира Польшу, является полным абсурдом. Основной целью советского руководства была остановка немецких войск, которые двигались на восток.

События 17 сентября 1939 года положили начало новому периоду в жизни всего белорусского народа, хотя в этом новом было не только положительное. Тем не менее, несмотря на серию отрицательных моментов, объединение Западной Белоруссии с БССР имело положительное значение.

## СТАН АДУКАЦЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ВЕРАСНЯ 1939 Г.

Вабішчэвіч А.М.

*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт*

У 1930-я гады польскія ўлады сталі на шлях канчатковай ліквідацыі нацыянальнай асветы беларусаў. Школьная рэформа ў Польшчы дала магчымасць рэжыму "санацыі" гэта паскорыць. Ідэя выхавання моладзі ў лаяльных адносінах да польскай дзяржавы стала дамінуючай у дзейнасці існуючых навучальных устаноў. У ходзе рэфармавання зроблены адыход ад пераемнасці і бесперапыннасці ў навучанні. Заходнебеларускія сяляне страцілі шансы павысіць свой адукацыйны ўзровень. Шматступенчатасць, высокая плата за вучобу і іншыя новаўвядзенні яшчэ больш абмежавалі доступ іх дзецям да сярэдніх школ, ВНУ, якія павінны былі рыхтаваць надзейныя кадры для рэжыма "санацыі". Пад выглядам дакладнага выканання заканадаўства 2 уцалелыя беларускія гімназіі (Віленская і Навагрудская) былі пераўтвораны яшчэ ў 1932 г. Лес Віленскай гімназіі ў 1938/39 навучальным годзе быў няпэўны. Папячыцельства Віленскай школьнай акругі загадала скасаваць першы клас. Хадатайніцтва дэлегатаў бацькаўскага камітэта перад міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы ў маі 1939 г. пленных вынікаў не дало. Аднак уступныя экзамены летам 1939 г. усе-такі праводзіліся.

У выніку асімілятарскай палітыкі польскіх улад пануючым тыпам нацыянальных школ у Заходняй Беларусі сталі менавіта польскія. Адпаведным чынам змяніліся і змест, формы, метады навучання і выхавання ў навучальных установах. Аднак нават польскія школы не задаволілі сацыяльна-эканамічныя, нацыянальна-культурныя патрэбы краю, павольна вялі барацьбу з неписьменнасцю. На тэрыторыю ў 100 км$^2$ на Віленшчыне і Навагрудчыне прыходзілася 5,4, Палессі – 3,4 школы, калі сярэдні паказчык па усёй Польшчы складаў 7,3 школы. У многіх заходнебеларускіх паветах, асабліва ў Палескім ваяводстве, існавалі "бясшкольныя акругі". У 1936 г. у палескім ваяводстве з 236 тыс. дзяцей школьнага ўзросту 53 тыс. (23%) не былі ахоплены пачатковым навучаннем. Як сведчыць інфармацыйная запіска намесніка наркама асветы БССР К. Чарнова, падрыхтаванная ім 25 кастрычніка 1939 г. у Беластоку, у заходнебеларускіх землях не было ахоплена школьным навучаннем не меньш 129800 дзяцей. Сярод дзяцей, што былі ахоплены гэтым навучаннем, шмат не хадзіла на вучобу. Прычыны гэтага – аддаленнасць школ, неабходнасць памагаць бацькам па гаспадарцы, адсутнасць абутку, адзення. Існуючыя пачатковыя школы не задавальнялі патрэбы няпольскага насельніцтва. Паводле інфармацыі К. Чарнова, з 6119 школ польскіх было 5932, рускіх – 3, яўрэйскіх –